ра, пропало понятие дресс-кода. Также в кадре часто стала появляться алкогольная и табачная продукция.

### Библиографические ссылки


1. Статистика аудитории России на YouTube / Mediascope [Электронный ресурс]. URL: https :// webindex. mediascope. net / report / sex–andbyDevice =3&byDevice =1&byDevice =2&byGeo =1&byMonth =202003&id =88155 (дата обращения 16.08.2020).
2. YouTube-каналы: январь 2020 // Медиалогия [Электронный ресурс]. URL: https://www.mlg.ru/ratings/socmedia/trends/7158/ (дата обращения 16.08.2020).
3. *Бороздина Г. В.* Психология делового общения : учеб. пособие. М. : Инфра-М, 2006.


# АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАГА МЕДЫЯДЫСКУРСУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ


***І. А. Герасімчык[1], А. Ю. Саладуха[2]***

*[1]Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 230000, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,*
*herasimchyk@mail.ru,*

*[2]Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 230000, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,*
*solfin394@gmail.com*



Артыкул прысвечаны вывучэнню праблематыкі функцыянавання гістарычнага ведання ва ўмовах інфармацыйнага грамадства. На аснове аналізу матэрыялаў сучасных беларускіх СМІ, якія ўтрымліваюць розныя па сваёй спецыфіцы гістарычныя звесткі, вызначаны асаблівасці фарміравання гістарычнага дыскурсу ў беларускай медыяпрасторы. Вылучаны і ахарактарызаваны групы публікацый, адрозныя спосабамі рэпрэзентацыі гістарычнай інфармацыі з улікам выбранай аўтарамі інфармацыйнай нагоды, мэтаў і метадаў апрацоўкі дадзеных.



***Ключавыя словы:*** гістарычная памяць; медыятызацыя гісторыі; гістарычны медыядыскурс; беларуская інфармацыйная прастора.

# FEATURES OF THE FORMATION OF HISTORICAL MEDIA DISCOURSE IN THE BELARUSIAN INFORMATION SPACE

***I. A. Herasimchyk*[a], *A. Y. Saladukha*[b]**

[a]*Yanka Kupala Grodno State University,*
*22, Ozheshko Str., 230000, Grodno, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. A. Herasimchyk (herasimchyk@mail.ru),*

[b]*Yanka Kupala Grodno state University,*
*22, Ozheshko Str., 230000, Grodno, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. Y. Saladukha (solfin394@gmail.com)*

The article is devoted to the research of the problems of functioning of historical knowledge in the information society. Based on the analysis of materials of modern Belarusian media containing historical information of various specifics, the author defines the features of the formation of historical discourse in the Belarusian media space. Groups of publications that differ in the ways of presenting historical information, taking into account the information occasions, goals and methods of data processing used by the authors, are identified and characterized.

***Key words***: historical memory; mediatization of history; historical media discourse; Belarusian information space.

Вырашэнню задач інфармаванасці грамадства, звязаных з вытлумачэннем сутнасці сучасных працэсаў і трансляваннем сацыякультурнага вопыту, спрыяе папулярызацыя навуковага гістарычнага ведання праз СМІ. Гістарычныя матэрыялы ўсё больш актыўна становяцца неад’емным элементам медыйнага дыскурсу, праз сувязь паміж сферамі медыя і акадэмічнай гісторыі фарміруецца новы – гістарычны – медыядыскурс. Значнасць задач папулярызацыі гістарычнага ведання абумоўлівае цікавасць да вывучэння асаблівасцей фарміравання гістарычнага дыскурсу ў беларускай інфармацыйнай прасторы. Аналіз кантэнту электронных версій традыцыйных друкаваных СМІ «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда», «Народная газета», «БелГазета», «Наша Ніва», а таксама анлайн-часопісаў «CityDog.by», «34mag.net» за перыяд 2015–2020 гг. дазволіў вылучыць падыходы журналістаў да выкарыстання ў публікацыях розных па спецыфіцы гістарычных звестак.

Журналісцкія тэксты, пабудаваныя праз выкарыстанне гістарычнай інфармацыі, складаюць тры групы з улікам выбранай аўтарамі інфармацыйнай нагоды, мэтаў і метадаў апрацоўкі гістарычных звестак: матэрыялы выключна гістарычнай тэматыкі; матэрыялы пра падзеі сучаснасці, тэматычна звязаныя з гісторыяй; матэрыялы пра сучасныя падзеі, тэматычна не звязаныя з гісторыяй.

Першая група – уласна гістарычныя публікацыі, мэта якіх – пазнаёміць аўдыторыю з пэўнай гістарычнай асобай ці падзеяй, прэзентаваць новыя гістарычныя факты. Для большасці тэкстаў гэтай групы характэрна каляндарная актуальнасць, г. зн. інфармацыйнай нагодай для іх з’яўлення становіцца святочная або юбілейная дата, угодкі з дня нараджэння гістрычных асоб і г. д.: *«Сто восемьдесят лет назад, 21 марта 1840 года, в Виленской губернии родился Франтишек Богушевич, один из начинателей современной белорусской литературы»* (СБ, 19.03.2020).

Асобнае месца займаюць публікацыі «латэнтнай актуальнасці» – гістарычна працяглай, прыхаванай, не звязанай з канкрэтнай падзеяй у сучасным жыцці. Падрыхтоўка падобных матэрыялаў сведчыць аб жаданні рэдакцый прэзентаваць аўдыторыі новыя цікавыя факты пра падзеі мінулага ад экспертаў у галіне гістарычнага ведання. Аўтарамі гістарычных тэкстаў такога тыпу, як правіла, становяцца прафесійныя гісторыкі, краязнаўцы, фальклarысты, пісьменнікі, якія рэалізуюць магчымасць паведаміць праз СМІ пра вынікі сваіх даследаванняў. У якасці крыніц інфармацыі ў дадзеным выпадку могуць выступаць архіўныя дакументы, даведачна-інфармацыйныя сістэмы (бібліятэкі і базы дадзеных, падручнікі і энцыклапедыі, даведнікі і слоўнікі), а значыць, у тэкстах нярэдка выкарыстоўваюцца такія канструкцыі, як «пісьмовыя крыніцы сцвярджаюць, што...», «як сцвярджае пісьменнік» і інш.: *«Письменные источники утверждают: первое поселение большой группы татар на территории ВКЛ образовалось в годы правления Витовта»* (СБ, 10.12.2019); *«Как говорит писатель Витовт Чаропка, “трэба было выбіраць, каму аддаць гетманскую булаву. Кароль хацеў віцебскаму ваяводзе Паўлу Сапегу”»* (СБ, 14.12.2019).

Нярэдка сярод матэрыялаў дадзенай групы вылучаюцца тэксты з уласнай актуальнасцю, мэта якіх – раскрыць турыстычны патэнцыял Беларусі, расказаць пра помнікі нацыянальнай гісторыі і культуры,

звярнуць увагу на іх праблемны стан: *«Чтобы понять, как это любить, CityDog.by отправил Сергея Кравченко в автомобильное путешествие по заброшенным белорусским усадьбам, молчаливым руинам и осенним лесам»* (CityDog.by, 28.11.2017).

У другую групу ўвайшлі публікацыі, мэта якіх – прэзентаваць падзеі сучаснасці, тэматычна звязаныя з гісторыяй. Дадзеныя тэксты, аўтарамі большасці з якіх з’яўляюцца прафесійныя журналісты, могуць быць прадстаўлены ў жанры рэпартажу, нататкі, нарыса, маюць непасрэдную актуальнасць, інфармацыйнымі нагодамі для іх узнікнення становяцца актуальныя падзеі і праблемы: адкрыццё помнікаў і мемарыялаў, музейных экспазіцый:*«Значительная часть новой музейной экспозиции отражает историю жизни татар-мусульман, поселившихся на территории Беларуси ещё по приглашению великого князя ВКЛ Витовта более шести веков назад»* (СБ, 06.12.2019); правядзенне тэматычных выстаў, тэатральных пастановак, курсаў і лекцый: «*400 работ, почти 100 художников послевоенной Германии – грандиозный по масштабам проект “Пути немецкого искусства с 1949 года по сегодняшний день” разместился во Дворце искусства. <…> О чём это? О преодолении наследия нацизма с помощью творчества»* (НГ, 13.03.2020); выданне кніг па гісторыі: *«Навагрудак, нагадаю, – першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, – расказвае пра кнігу, якая здадзена ў выдавецтва, сам аўтар»* (Звязда, 12.04.2020).

Акрамя архіўных матэрыялаў і заключэнняў экспертаў у галіне гісторыі, у якасці крыніцы інфармацыі могуць выкарыстоўвацца словы прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады, арганізатараў выстаў і іншых мерапрыемстваў. Для выданняў «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка» і «Наша Ніва» характэрным з’яўляецца размяшчэнне тэкстаў першых дзвюх груп у спецыяльных тэматычных рубрыках – «Гісторыя і Этнаграфія», «Краязнаўства», «Архітэктура», «Старонкі гісторыі». У анлайн-часопісах «CityDog.by» і «34mag.net», якія маюць больш развітую рубрыкацыю, акрамя раздзела «Гісторыя», створаны і іншыя – «Як гэта любіць?», «Мінск 1067». Такі тэматычны падзел публікацый не толькі спрашчае навігацыю па сайтах, але і сведчыць пра спецыфіку канцэпцыі медыя.

Асаблівасцю выдання «СБ. Беларусь сегодня» з’яўляецца стварэнне тэматычных праектаў, прысвечаных розным юбілейным датам у гісторыі Беларусі. Напрыклад, у гонар 75-годдзя Перамогі ў Вялікай

Айчыннай вайне на сайце www.sb.by былі прэзентаваны праекты «Беларусь памятае», «Партызаны Беларусі», у межах якіх у фармаце сторытэйлінгу падаюцца як выключна гістарычныя публікацыі, так і тэксты пра падзеі сучаснасці, тэматычна звязаныя з мінулым.

Трэцюю групу складаюць публікацыі, тэматычна не звязаныя з гісторыяй, у якіх па той ці іншай прычыне былі выкарыстаны гістарычныя звесткі. Такі наратыў пра сучасныя падзеі праз апеляцыю да гісторыі характэрны для калумністыкі, калі аўтар спрабуе правесці аналогію паміж мінулым і сучаснасцю для прагназавання развіцця падзей або дыскрэдытацыі сучаснасці ў той ці іншай сферы: *«COVID-алармисты любят поминать “испанку” – самую массовую эпидемию гриппа в истории, прокатившуюся по миру в 1918–19 гг., охватившую 550 млн человек и погубившую около 100 млн. Но сегодня такая эпидемия невозможна. Число жертв “испанки” объясняется тем, что она пришлась на годы войны. <…> У коронавируса такой почвы нет»* (БГ, 24.03.2020).

Выкарыстанне гістарычнай інфармацыі такога характару ўласціва матэрыялам, размешчаным у рубрыках «Грамадства», «Палітыка», «Эканоміка» грамадска-палітычных выданняў, а таксама для публікацый у аўтарскіх калонках на сайтах «БелГазеты», «СБ. Беларусь сегодня». У анлайн-часопісах «CityDog.by», «34mag.net» гістарычная інфармацыя нярэдка з’яўляецца ў рэпартажах як дадатковая, што забяспечвае павышэнне пазнавальнага патэнцыялу тэкстаў. У залежнасці ад тэмы публікацыі і мэты, якой хоча дасягнуць аўтар, у публікацыях дадзенай групы могуць выкарыстоўвацца звесткі як з гісторыі Беларусі, так і з гісторыі іншых дзяржаў свету. Аўтарамі прыводзяцца факты з гісторыі Сярэднявечча і Новага часу, але найчасцей згадваюцца падзеі і асобы з найноўшай гісторыі, паколькі гэты перыяд з’яўляецца найбольш даследаваным і вядомым аўдыторыі СМІ.

У публікацыях, тэматычна не звязаных з гісторыяй, выкарыстоўваюцца ўсе акрэсленыя вышэй крыніцы інфармацыі, аднак часцей за ўсё аўтары не падаюць дадатковых пацверджанняў дакладнасці прэзентаваных гістарычных звестак. Звязана гэта можа быць і з тым, што факты з мінулага, якія прыводзяцца журналістамі, маюць агульнавядомы характар, і з разлікам аўтараў забяспечыць ці не забяспечыць зразумеласць і даступнасць інфармацыі для чытачоў без дадатковых тлумачэнняў: *«“6 августа 1945 года Японию постигла*

*страшная трагедия, жертвами которой стали сотни тысяч человек", – с грустью рассказывает своим зрителям канал Euronews. И ни слова о том, кто же это сбросил на Хиросиму и Нагасаки единственные пока реально примененные на Земле атомные бомбы. А были это Соединенные Штаты Америки»* (СБ, 07.05.2020). Праз адсылку да раней вядомых фактаў, згодна з канонамі псіхалогіі ўздзеяння, дасягаецца самы высокі ўзровень даверу да словаў аўтара, а значыць, найбольш яскрава праяўляецца сіла ўздзеяння гістарычнай інфармацыі на свядомасць аўдыторыі.

Такім чынам, журналісцкія публікацыі ў беларускіх СМІ, пабудаваныя праз выкарыстанне гістарычнай інфармацыі, адрозніваюцца як інфармацыйнай нагодай, так і выбранымі аўтарамі мэтамі і метадамі апрацоўкі гістарычных звестак. Актуальныя гістарычныя факты і фрагменты гістарычнай рэчаіснасці, становячыся часткай кантэнту сучасных медыя, інтэрпрэтуюцца ў журналісцкім тэксце, выступаюць сродкамі аргументацыі, што сведчыць пра пашырэнне працэсу медыятызацыі гісторыі.

## ВЕЧЕРНЯЯ ПРЕССА КАК ЗНАЧИМЫЙ ЭЛЕМЕНТ КОММУНИКАЦИИ СОВРЕМЕННОГО БЕЛОРУССКОГО ГОРОДА

***В. Л. Герцев***

*Барановичская объединенная газета «Наш край»,*
*ул. Пирогова, 5, 225409, г. Барановичи, Республика Беларусь,*
*vg20089@yandex.ru*

Вечерние газеты остаются значимым элементом в сложной системе городской коммуникации. Цель данного исследования – выяснить причины востребованности вечерней прессы в коммуникационных процессах современного белорусского города. Дается определение вечерней прессы, анализируется ее типологическая специфика, иные факторы, которые обусловили социальную востребованность изданий. Результаты исследования могут принести практическую пользу медиаменеджерам.

***Ключевые слова:*** вечерние газеты; городская коммуникация; типология; содержание; стилистика.